**Вернісаж.** Выстаўка «Ад Нёмана да Ціхага акіяна: гісторыя вандровак і геаграфічных даследаванняў», прымеркаваная да 70-годдзя Беларускага геаграфічнага таварыства і 90-годдзя факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Экспазіцыя расказвае аб станаўленні геаграфіі ў краіне і ўнёску знакамітых першапраходцаў — выхадцаў з Беларусі, увекавечаных у падручніках і геаграфічных картах свету. Сярод экспанатаў — рэдкія кнігі і карты, сучасная тэматычная літаратура. Прадстаўлены партрэты і кароткія біяграфічныя звесткі пра беларускіх падарожнікаў і географаў. Дарэчы, падчас адкрыцця прэзентавалі кнігі «Географы Беларусі. Біяграфічны даведнік», «Пружанскі край на старадаўніх картах» і «Пружанская кулінарыя: 76 унікальных рэцэптаў». Выстаўка прадоўжыцца да 21 красавіка.